**Пётра Мурзёнак: ДЗЕНЬ ЧОРНАЙ СТУЖКІ Ў КАНАДЗЕ (дзень памяці наступстваў пакта Молатава-Рыбетропа)**

76 год таму назад быў заключаны таемны пакт Молатава-Рыбентропа. Відавочна, што ў краінах, дзе гэтыя дзеячы былі міністрамі замежных спраў, такая падзея ніяк не адзначаецца. У той жа час пра гэту дату не забываюцца грамадзяне тых краін, якія былі ахвярамі гэтага ганебнага дагавору і не толькі ў сваіх краінах, але і за іх межамі, дзе яны апынуліся ў выніку катастрафічнага падзелу Еўропы падчас 2-й сусьветнай вайны.

У Канадзе, Дзень чорнай стужкі, які з'яўляецца часткай Нацыянальнага дня памяці, адзначаецца як дзень сумна вядомага дагавора Молатава-Рыбентропа (1939) паміж Савецкім Саюзам і нацысцкай Германіяй, які непасрэдна прывёў да акупацыі большасьці краін Цэнтральнай і Усходняй Еўропы, Фінляндыі і Балтыі і забою і прыгнёту дзесяткаў мільёнаў людзей. Адзначэньне гэтага дня каардынуецца з 2009 году Саветам Канады па Цэнтральнай і Усходняй Еўропе ў супрацоўніцтве з нацыянальнымі суполкамі.

У гэтым годзе адзначэньне Дня чорнай стужкі прайшло ў 8 гарадах Канады, уключаючы Аттаву, Таронта, Ванкувер, Вінніпег і іншыя гарады.




У Аттаве гэту падзею адзначалі ва Украінскай уніяцкай царкве ім. св. Яна, у дзень заключэньня Пакта, 23 жніўня 2015 года. Каб памянуць ахвяр камуністычнага рэжыма і нацыскай тыраніі тут сабраліся прадстаўнікі нацыянальных суполак Беларусі, Чэхіі, Эстоніі, Венгрыі, Латвіі, Літвы, Польшчы, Славакіі і Украіны, а таксама прадстаўнікі амбасад многіх з упамянутых вышэй краін. Вечар пачаўся з паніхіды, якую правялі сьвятары Ігар Охрымчук (Украінская праваслаўная царква) і Зянон Хентош (Украінская уніяцкая царква). Затым са зваротамі-малітвамі выступілі прадстаўнікі суполак. Ад беларускай суполкі быў прачытаны верш

Ларысы Генюш “Малітва” ( у перакладзе на ангельскую Пятра Мурзёнка) і прадстаўлена інфармацыя пра складаны і ахвярны лёс для бацькаўшчыны паэта і чалавека.

Далей вечар праходзіў у грамадскай зале царквы. Са зваротам і віншаваньнем гасьцей выступіў Andris Ķesteris, старшыня Савета па Цэнтральнай і Ўсходняй Еўропе Канады (Central and Eastern European Council of Canada).



Andris Ķesteris

Rūta Auziņa, з латыскай суполкі, выканала разам з прысутнымі канадыйскі гімн.

Слова было дадзена запрошнаму госьцю, Ганароваму сп. Роялу Галіпо (Royal Galipeau), сябру парламента Канады ад кіруючай, кансерватыўнай партыі (акруга Ottawa-Orléans). У сваім дакладзе ён адзначыў тыя наступствы, якія былі вынікам гэтага Пакта, успомніў халакост, галадамор, шматлікія ахвяры народаў паняволеных краін, і запэўніў, што кансерватыўны ўрад Канады і надалей будзе падтрымліваць імкненьне народаў да свабоды і дэмакратыі, і ў прыватнасьці, партрымліваць Украіну супраць расійскай агрэсіі. Таксама, ён выказаў упэўненасьць, што помнік ахвярам камунізму будзе устаноўлены ў Аттаве ў адпаведнасьці з тымі абяцаньнямі, якія даў урад Канады. Пазьней на гэту тэму выступіў і сп. Людвіг Клімковскі, адказны за рэалізацыю гэтага праекта (Ludwik Klimkowski, Chair of Tribute to Liberty - Memorial to the Victims of Communism).

Вечар скончыўся заключным словам сп. Andris Ķesteris, лёгкім пачастункам, кавай, і размовамі.



Арганізатары вечара, прадстаўнікі амбасадаў і суполак Аттавы

Падчас адзначэньня Дня чорнай стужкі сярод на паседжаньнях быў распаўсюджана заява прэм’ер-міністра Канады сп. Харпера (англійскі варыянт зьмешчаны ў канцы артыкула). Ніжэй падаем беларускі пераклад заявы:

**Заява прэм'ер-міністра Стывена Харпера на Дзень Чорнай стужкі**
*23 жніўня 2015 года*

Прэм'ер-міністр Канады Стывен Харпер робіць гэтую заяву, каб адзначыць Дзень чорнай стужкі, Нацыянальны дзень памяці ахвяр камунізму і нацызму ў Еўропе. "У гэты дзень у 1939 годзе нацысцкая Германія і камуністычны Савецкі Саюз падпісаў праслаўуты дагавор Молатава-Рыбентропа аб ненападзе, які ў канчатковым выніку прывёў да Другой сусьветнай вайны. Гэтыя тыранічныя рэжымы занялі большую частку Цэнтральнай і Усходняй Еўропы, у выніку чаго адбыліся незлічоныя разбурэньні і бессэнсоўныя пакуты, і жорсткае забіцьцё мільёнаў нявінных мужчын, жанчын і дзяцей. Сёньня ўсе канадцы далучацца да мяне і аддадуць належнае памяці дзесяткаў мільёнаў еўрапейскіх ахвяр камуністычных і нацысцкай тыраніі, у гонар адважных мужчын і жанчын, якія супрацьстаялі гэтым злым рэжымам, каб абараніць свае каштоўнасьці, перакананьні і веравызваньні. На жаль, занадта шмат мужчын, жанчын і дзяцей па-ранейшаму сутыкаюцца з жорсткасьцю і рэпрэсіямі па ўсім сьвеце сёньня. Канадцы бачаць дзікунства, якое захоўваецца ў сучасным сьвеце, і тое, што мы назіраем на прыкладзе цяжка-

ўяўляемых варварстваў ISIS ў адносінах да нявінных рэлігійных і этнічных меншасьцяў. Ва ўмовах пагрозы для ўласнай бясьпекі і чалавечай годнасьці па ўсім сьвеце, мы не будзем сядзець збоку. Мы рашуча супрацьстаім ISIS, культу тэрарыстычнага генацыду, які вынішчае нявінных жанчын, дзяцей і прадстаўнікоў меншасьцяў. Я ганаруся мужчынамі і жанчынамі канадскіх ўзброеных сілаў, якія дзейнічаюць, каб абараніць мільёны нявінных людзей, якія сутыкаюцца з жорсткасьцю ISIS. Акрамя таго, з пачатку агрэсіі рэжыму Пуціна ва Усходняй Еўропе наш ўрад кансерватараў стаіць цвёрда на баку Украіны, Польшчы і нашых балтыйскіх сяброў супраць мілітарызму Пуціна, і па-ранейшаму адданыя таму, каб разам з нашымі саюзнікамі па НАТО будаваць рэгіянальную стабільнасьць і бясьпеку ў рэгіёне.

Я магу з гонарам сказаць, што наш кансерватыўны ўрад па-ранейшаму прыхільны да будаўніцтва Нацыянальнага мемарыялу ахвяр камунізму і Нацыянальнага помніка Халакосту, мемарыялам, прысвечаным ўшанаваньню і захаваньню спадчыны мільёнаў мужчын, жанчын і дзяцей, якія змагаліся супраць гэтых злавесных рэжымаў. У 2009 годзе, парламент абвясьціў Дзень чорнай стужкі як нацыянальны дзень памяці, і таму я заклікаю ўсіх канадцаў прыняць удзел у адной з чарговай памятных цырымоній, якія адбываюцца па ўсёй краіне. Я таксама заклікаю канадцаў працягваць абараняць і падтрымліваць канадскія каштоўнасьці свабоды, дэмакратыі, правоў чалавека і вяршэнства закона, каб такое гістарычнае зло ніколі не ўзнікла зноў ".

Нагадаем, пра сам Пакт, заключаны 23 жніўня 2015 года, непасрэдныя ўдзельнікі якога паказаны ніжэй на здымку.



*J. von Ribbentrop, J. Stalin and V. Molotov after signing the Nazi-Soviet Non-aggression Pact in Kremlin, Moscow, August 23, 1939 (Wikipedia)*

Пакт Рыбентропа-Молатава, гэта неафіцыйная назва дамовы аб ненападзе, заключанай паміж Германіяй і СССР, і падпісанай 23 жніўня ўвечары ў Маскве міністрам замежных спраў Германіі Іаахімам фон Рыбентропам і савецкім міністрам замежных спраў Вячаславам Молатавым. У дадатак да заявы аб ненападзе, дагавор уключаў сакрэтны пратакол, які ня быў вядомы на працягу доўгага часу, паводле якога Цэнтральная і Усходняя Еўропа была раздзелена на дзве зоны ўплыву - савецкую і нямецкую: пад раздзел траплялі тэрыторыі Польшчы, Румыніі, Літвы, Латвіі, Эстоніі і Фінляндыі. У якасці непасрэднага выніку гэтай дамовы, Германія напала на Польшчу з трох напрамкаў (захад, поўнач і поўдзень) 1 верасня 1939 года. Пасьля савецка-японскага перамір’я, якое пачалося 16 верасьня, Савецкі Саюз таксама ўварваўся ў Польшчу (з усходу) 17 верасня. 30 лістапада, савецкія войскі напалі на Фінляндыю (крывавая зімовая вайна 1939-1940 гг.). Пакт Рыбентропа-Молатава перадзяліў карту Еўропы, якая была складзена пасля Версальскай дамовы ў 1919 годзе, правёў да пачатку Другой сусьветнай вайны і наступнаё халоднай вайны.

Новы канфлікт у Украіне з'яўляецца страшным напамінам, што пуцінская Расея ідзе па слядах СССР. Гэта робіць выкарыстанне маніпуляцый і грубай сілы, для аднаўлення імперыі зла.




Planned and actual changes of territories in 1939-1940 time frame (Wikipedia)

**Statement by Prime Minister Stephen Harper on Black Ribbon Day**

August 23, 2015

Prime Minister Stephen Harper issued this statement to mark Black Ribbon Day, the National Day of Remembrance for the Victims of Communism and Nazism in Europe:

"On this day in 1939, Nazi Germany and the Communist Soviet Union signed the notorious non-aggression Molotov-Ribbentrop Pact, which ultimately led to the Second World War. These tyrannical regimes occupied most of Central and Eastern Europe, ultimately causing incalculable destruction and senseless suffering, and brutally murdering millions of innocent men, women and children.

"Today, all Canadians join me in paying tribute to the memory of the tens of millions of European victims of Communist and Nazi tyranny, and honouring the brave men and women who stood up to these evil regimes to defend their values, beliefs and faiths.

"Regrettably, too many men, women and children continue to face brutality and repression around the world today. Canadians have seen savagery persist in the world today, as we witness the unspeakable barbarism of ISIS onto innocent religious and ethnic minorities. In the face of a threat to our own security and human dignity around the world, we will not sit on the sidelines. We will decisively confront ISIS, a genocidal terrorist cult, that is summarily executing innocent women, children and minorities. I am proud of the men and women of the Canadian Armed Forces who are acting to protect the millions of innocent people who face ISIS brutality. Moreover, since the start of the Putin regime's aggression in Eastern Europe our Conservative government has stood firmly with Ukraine, Poland and our Baltic friends against Putin's militarism, and remain committed, together with our NATO allies, to building regional stability and security in the region.

"I am proud to say that our Conservative government also remains committed to the construction of a National Memorial to Victims of Communism and a National Holocaust Monument, memorials dedicated to honouring and preserving the legacy of the millions of men, women and children who struggled against these sinister regimes.

"In 2009, Parliament declared Black Ribbon Day a national day of remembrance and so I encourage all Canadians to take part in one of the many Black Ribbon Day commemorative ceremonies taking place across the country. I also encourage Canadians to continue to protect and promote Canadian values of freedom, democracy, human rights and the rule of law to prevent such historical evils from ever taking hold again."

**Piotra Murzionak: Black Ribbon Day in Canada (remembrance day of communist and Nazi victims, consequences of Molotov-Ribbentrop Pact)**

*(Abstract, magazine "CULTURE, NATION", September 2015, issue 11, pp. 21-27)*

The information about Black Ribbon Day, a national day of remembrance of victims of Communist and Nazi tyranny is provided. The event took place at the St. John the Baptist Ukrainian Catholic National Shrine in Ottawa on August 23, 2015.